*Петрушенко Клавдия*

**«Вясковай жанчыне»**

Так мала годных слоў... І ўсё ж бяруся
Уславіць простай рыфмаю нямой
Вясковую жанчыну Беларусі.
Бо лёс яе – таксама лёс і мой.
Святочнай сцэнай, буднямі будоўлі –
Нам ёсць чым ганарыцца. І паўсюль –
Ад Браслава да Хоцімска й Нароўлі –
Шануюць жонак, мам, сясцёр, бабуль.

Звычайная вясковая жанчына.
Сыноў гадуе. Росціць хлеб і лён.
Даярка ці настаўніца – Айчына
Удзячна ёй за рук і думак плён.
Яна – падтрымка мужу, сыну, брату.
Чакаць умее, дружбай даражыць.
А трэба – і ў палаючую хату
Без роздумаў-ваганняў забяжыць.

Жыццё тварыць уласнымі рукамі,
З любоўю шчырай – гэта пра яе.
На жаль, чытаць Басё і Муракамі
За клопатамі часу не стае.
Сама ж дзясяткі песень-калыханак
Складае над калыскаю ўначы.
Ёй звычна сустракаць на полі ранак
І дранікі на снеданне пячы.

Яна ў сям'і адказная за шчасце:

Аберагаць яго ў ліхія дні,

Бы нітку залатога шоўку прасці

З бясконцай і цярплівай дабрыні.

Спраўляецца з рыдлёўкай і з іголкай.

П'янкую чарку госцю паднясе.

І з'явіцца сама то сціплай зёлкай,

То ружай у брыльянтавай расе.

Яе не вабяць Ніцы, Куршавелі,

Амары, піцы з культавым віном.

Ёй важна, каб ля хаты вішні спелі,

Ды каб цвілі вяргіні пад акном.

І ёй за радасць – з юнымі дзяліцца

Разважлівасцю мудрага чуцця.

Хай шчасціць ёй, традыцый праваднíцы,

Карміцельцы, ахоўніцы жыцця.